*У. М. ШЛАПУНОЎ*

# КОРМАВЫТВОРЧАСЦЬ — ВАЖНЕЙШАЯ ПРАБЛЕМА ЗЕМЛЯРОБСТВА РЭСПУБЛІКІ

Сярод мноства праблем сельскай гаспадаркі асноўнай з'яўляецца кармавытворчасць. На яе працуе каля 80% сельскагаспадарчых угоддзяў і прыкладна 70% навуковага патэнцыялу. Яна з'яўляецца асноўным фактарам развіцця і стабільнасці жывёлагадоўлі, забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання. Аднак, як і ўся сельскагаспадарчая вытворчасць, колькасць і якасць нарыхтоўваемых кармоў зніжаецца. Прычыны гэтага не толькі арганізацыйна-тэхналагічныя, але і палітычныя. Калі ў цэнавую палітыку закладваецца больш палітычнае адценне, а не сур'ёзны, адказны навукова абгрунтаваны разлік, яна можа забяспечыць часовую палітычную стабільнасць, але ў далейшым непазбежна прывядзе да дэпрэсіі ў гаспадарчым і грамадскім жыцці.

Так, дапушчаны раней прыярытэт цэнаў на збожжа над жывёлагадоўчай прадукцыяй выклікаў скарачэнне пагалоўя жывёлы і адпаведна аслабленне ўвагі да кормавытворчасці. У канчатковым выніку і пагалоўе скарацілася, і кармленне яго пагоршылася. Недахоп кармоў і нізкая якасць з'явіліся прычынай значнага іх перарасходу на адзінку жывёлагадоўчай прадукцыі.

Дапушчаны непарытэт цэнаў на карысць прамысловай прадукцыі і на страту цэнам на прадукцыю сельскай гаспадаркі ўжо прывёў да негатыўных наступстваў для ўсёй дзяржавы, на выпраўленне якіх спатрэбіцца працяглы час.

Зараз неабходна вялікая карпатлівая праца, каб выправіць становішча і выйсці хаця б на раней дасягнуты ўзровень. У гэтай працы не трэба шукаць звяно, пацягнуўшы за якое можна выцягнуць увесь ланцуг. Гэта алхімізм — такога звяна не існуе, асабліва ў вырашэнні такой глабальнай комплекснай для рэспублікі праблемы, як кормавытворчасць. Бліжэйшая задача ў гэтай вобласці — выйсці на ўзровень, ужо дасягнуты ў 1990—1991 гг., мець 19—20 млн т. карм. адз. Вядома, што рост вытворчасці кармоў быў дасягнуты пры выкарыстанні даволі істотных фактараў інтэнсіфікацыі.

Ва ўмовах жа рэзкага абмежавання надзвычай важна, каб кожны работнік вытворчасці звяраў свае рашэнні з рэкамендацыямі навукі. Напрыклад, за кошт павелічэння ўдзельнай вагі ў травасумесях шматгадовых бабовых траў на лугах і ворыве рэспубліка можа за 3—4 гады выйсці на 3—3,5 т карм. адз. з гектара пры эканоміі каля 250 тыс. т азоту. У БелНДІ земляробства і кармоў створаны новыя сарты канюшыны, якія забяспечваюць больш высокі ўзровень азотфіксацыі і даўгалецця, абгрунтаваныя тэхналогіі вырошчвання.

З улікам разнастайнасці глебаў неабходна пашырыць пасевы і іншых бабовых культур: люцэрны, донніка, галегі ўсходняй, эспарцэту, азімай вікі. Акрамя сенажацева-пашавых угоддзяў за кошт біялагічных фіксатараў азоту, такіх, як гарох, лубін, віка, можна без ужывання азоту падтрымліваць высокую прадукцыйнасць поля аднагадовых траў на плошчы больш за 300 тыс. га.

У сувязі з высокім коштам імпартуемага насення кукурузы ўзнікла праблема вытворчасці сіласу. Адным са шляхоў яе вырашэння будзе выкарыстанне зернефуражных культур з бабовымі кампанентамі ў малочна-васковай спеласці на зернесянаж.

Такім чынам, усямернае пашырэнне кармавых пасеваў з удзелам бабовых культур на лугах і ворных землях — адна з галоўных задач кормавытворчасці да 2000 года. Гэта і асноўны накірунак у вырашэнні праблемы бялку. У склаўшыхся ўмовах як ніколі вялікая роля навуковага забеспячэння. Няма падстаў спадзявацца на тое, што з аб'яўленнем паходу ў рыначную эканоміку адразу ўзмоцніцца інтэграцыя навукі і вытворчасці. У часы партыйнага кіраўніцтва гэтай інтэграцыі надавалася шмат увагі. Доследныя палі калгасаў, навукова-практычныя семінары, канферэнцыі, планы ўкаранення і справаздачы па іх, аператыўная кансультатыўная дапамога спецыялістам і мноства іншых мерапрыемстваў забяспечвалі своечасовае асваенне новых тэхналогій.

Зараз аслабанілі гаспадаркі ад адміністрацыйна-тэхналагічнага ўмяшання, але і не наблізілі да іх кансультацыйную службу, якой павінна быць навука. А гэта адзін з важнейшых рэзерваў у сельскай гаспадарцы.

На падтрыманне навукі зараз выдзяляецца бюджэтнага фінансавання толькі 45—50% да патрэбы. Чаму б нехапаючыя 50—55% не выдзяляць навуцы з цэнтралізаваных крыніц для прапаганды і ўкаранення дасягненняў навукі? У гэтым выпадку захаваецца навуковы патэнцыял і вырашыцца пытанне навуковага забеспячэння сельгаспрадпрыемстваў. Акупальнасць гэтых затратаў будзе шматразовай ужо ў год іх выкарыстання.

Некалькі слоў пра рэарганізацыю ў навуцы. Гэты працэс пастаянны. Але ў наш нестабільны час нельга дапускаць паспешлівасць. Стварылі Інстытут лёну, але немагчыма было забяспечыць яго неабходнай базай для эфектыўнага функцыянавання. Думаю, паспяшаліся прынізіць і ролю Інстытута меліярацыі, асабліва на фоне другаснага забалочвання зямель. Не вырашыўшы праблемы меліярацыі, нагрузілі яго яшчэ адным накірункам — лугаводствам, і гэта пры наяўнасці Інстытута земляробства і кармоў. Навуковы цэнтр па кормавытворчасці даўно склаўся ў Жодзіне, дзе размешчаны Інстытут земляробства і кармоў і Інстытут жывёлагадоўлі, дзякуючы чаму ёсць магчымасць комплекснага вырашэння праблемы і кваліфікаванай яе каардынацыі. Наўрад ці Інстытут меліярацыі і лугаводства пачне зараз укамплектоўваць свае штаты заатэхнікамі, ствараць неабходную базу. Думаю, што памылку трэба выпраўляць і мець па кормавытворчасці адну рэспубліканскую праграму.

І яшчэ пра праблему лёну. Навука мае навукова абгрунтаваныя тэхналагічныя працэсы вытворчасці 10—12 ц/га льновалакна, якія даступныя гаспадаркам і ўжо шмат якімі асвоены. Ёсць прадукцыйныя, адказваючыя сучасным патрабаванням сарты. Асваенне навуковых рэкамендацый дазволіць выйсці на вытворчасць 100—110 тыс. т ільновалакна і больш. Але неабходна паскорыць стварэнне акцыянернага таварыства або асацыяцыі вытворцаў і перапрацоўшчыкаў ільнопрадукцыі, узмацніўшы для калгасаў і саўгасаў матывацыю вытворчасці льновалакна і льнасемя наогул і на экспарт у прыватнасці. У такім аб'яднанні істотна ўзрасце і доля навуковага забеспячэння галіны. Гэта датычыць зацягнуўшагася стварэння і асацыяцый «Насенне», «Рапс» і інш.

Хацелася падняць яшчэ адно пытанне, якое мае дачыненне і да кормавытворчасці. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дазволена рэфармаванне сельгаспрадпрыемстваў з мэтай павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Думаю, што разнастайнасць варыянтаў рэфармавання будзе вялікай. Але было б правільным мець хаця б адзін прыклад рэфармавання калгаса на базе не дзяржаўнай, а прыватнай уласнасці на зямлю. Ёсць падставы лічыць, што ў гэтым выпадку калектыўная вытворчасць застанецца, але рэфармаванне гаспадаркі будзе больш радыкальным і эфектыўным. Такі эксперымент дапоўніць інфармацыю, неабходную пры распрацоўцы накірункаў развіцця сельскай гаспадаркі на перспектыву.